**У. Жыгалка**

# ПАМІЖ ПАВАГАЙ І ІРОНІЯЙ
## (на матэрыяле карэйскай мовы)

Ганарыфік – моўны паказчык, які ўжываецца для выказвання павагі чалавеку, які часцей за ўсё знаходзіцца вышэй у сацыяльнай іерархіі, старэйшы, чужы.

Мэта даследавання – прааналізаваць выкарыстоўванне ганарыфіка нось-бітамі карэйскай мовы ў сацыяльнай сетцы Інстаграм, адсачыць, ці ёсць семантычны зрух ва ўмовах яго некананічнага выкарыстання. Інстаграм быў выбраны ў якасці платформы для аналізу праз прастату пошуку матэрыялаў па хэштэгу, нагляднасці прыкладаў ды праз факт актыўнага яго выкарыстання маладымі людзьмі.

Было прааналізавана сумарна 445 публікацый у Інстаграме з хэштэгамі, інфінітыўнай формай якіх з'яўляецца дзеяслоў *주무시다* 'спаць': #*주무시다*, #*주무셔*, #*주무셔요* (хэштэг выкарыстоўваецца ў сацыяльных сетках для апісання агульнай тэмы твіта ці іншага паста).

Выяўлена, што толькі ў 4 % выпадкаў (16 публікацый) дзеяслоў быў ужыты для апісання такіх сітуацыі, якія суадносяцца са значэннем яго ў слоўніку. У астатніх выпадках можна пабачыць факты незвычайнага ўжывання, напрыклад: дадзены ганарыфік выкарыстоўвалі ў якасці хэштэга пры апісанні розных жывёл, якія спяць (побач з *고슴도* 'вожык', *개구리* 'жаба', *말* 'конь', *거북* 'чарапаха', *판* 'панда' і інш.), маленькіх дзяцей, якія спяць (*아이*), п'яных людзей (*취하신분*), а таксама побач з намінацыямі алкаголю (*술*) і ежы (*갈비*, *김치 찌개*, *떡볶이*, *삼계탕* і інш.). Варта адзначыць, што часцей за ўсё гэты дзеяслоў ужываўся з фотаздымкамі сабак – 146 публікацый (33 %), дзяцей – 138 публікацый (31 %) і катоў – 58 публікацый (13 %): 1) *한숨푹~주무셔 아들이랑?* 'Уздых ~спіце з сынам?'; #*아들* #*자장가* #*주무셔* '#сын #калыханка #спіць'; 2) *우리 량이는 반 사람* 'Наша Ряні напалову чалавек'; *취침 준비 완료하고 벌써 주무시는 반려견ㅋㅋㅋ* 'Толькі збіраліся спаць, а яна ўжо спіць ахаха'; #*믹스견*#*한사람*#*주무셔* '#дварняк#напаловучалавек#спіць'.

Такім чынам, дзеяслоў, які першапачаткова выкарыстоўваўся толькі для апісання дзеяння паважанага чалавека, можа выкарыстоўвацца і ў іншых сітуацыях. У такіх выпадках дзеяслоў набывае камічныя ноткі (побач з намінацыямі п'яных людзей, алкаголю, ежы) ці ноткі замілавання (побач з намінацыямі жывёл і дзяцей).